# «Цвярозасць народа стане новай свабодай»

## Антыалкагольная дзейнасць епіскапа Мітрафана Гомельскага (Краснапольскага)

**Дзеля вырашэння сённяшніх задач мы часта звяртаемся да вопыту мінулага. Такая значная праблема, як алкагалізацыя, якая ахапіла фактычна ўсе слаі грамадства, незалежна ад полу і ўзросту, сёння знаходзіцца ў цэнтры ўвагі дзяржавы і навукоўцаў. Тым больш карысным для нас будзе дазнацца, як у пачатку мінулага стагоддзя дзяржава і грамадства сумеснымі намаганнямі імкнуліся перамагчы п'янства і алкагалізм.**



**Сяргей МЯНЬЧЭНЯ,**
**старшы выкладчык кафедры філасофіі і гісторыі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта**

У ліпені 2014 года споўнілася 95 гадоў з дня смерці епіскапа Мітрафана (Краснапольскага). Ён быў расстраляны ў 1919 годзе бальшавікамі за контррэвалюцыйную дзейнасць, у жніўні ж 2000 года яго прылічылі да ліку навамучанікаў Рускай праваслаўнай царквы. Палітычная дзейнасць епіскапа Мітрафана добра вядомая і шырока прадстаўлена ў айчыннай гістарыяграфіі, а вось яго антыалкагольная праца заставалася маладаследаванай *[1, с. 12–14]*. Адсутнічае інфармацыя аб ёй і ў біяграфіі Мітрафана, размешчанай на афіцыйным сайце Гомельскай епархіі *[2]*. Між тым епіскап Мітрафан адыграў значную ролю ў прапагандзе здаровага ладу жыцця і барацьбе з п'янствам у Расійскай імперыі ў пачатку XX стагоддзя.

Мітрафан (сапраўднае імя Дзмітрый Іванавіч Краснапольскі) нарадзіўся 22 кастрычніка 1869 года ў вёсцы Аляксееўка Біручанскага павета Варонежскай губерні. Пасля заканчэння са ступенню кандыдата багаслоўя Кіеўскай духоўнай акадэміі яго прызначылі інспектарам Іркуцкай духоўнай семінарыі. У 1902 годзе ў сане архімандрыта быў пераведзены ў Магілёў і прызначаны рэктарам мясцовай духоўнай семінарыі. 25 студзеня 1907 года Мітрафан стаў епіскапам Гомельскім, вікарыем Магілёўскай епархіі *[2]*.

У 1907 годзе епіскап Мітрафан Гомельскі быў абраны дэпутатам III Дзяржаўнай Думы Расіі ад Магілёўскай губерні. Там і адбылося яго знаёмства са знакамітым барацьбітом за цвярозасць М. Чэлышавым. 4 снежня група дэпутатаў падпісала заяву аб неабходнасці адмовы ад спагнання падаткаў праз продаж спіртных напояў, што стала падставай для стварэння Камісіі аб мерах барацьбы з п'янствам. У склад камісіі ўвайшлі 22 дэпутаты. Старшынёй быў абраны епіскап Мітрафан, а яе ідэйным лідэрам і намеснікам старшыні стаў М. Чэлышаў.

Камісія павінна была вызначыць асноўныя кірункі антыалкагольнай палітыкі дзяржавы і ўнесці папраўкі ў заканадаўства з мэтай адмовы ад палітыкі «п'янага бюджэту». Яе члены выступалі з патрабаваннямі абмежаваць вытворчасць алкаголю і разгарнуць антыалкагольную прапаганду. Распрацаваны камісіяй законапраект аб мерах барацьбы з п'янствам выклікаў неадназначную рэакцыю сярод дэпутатаў, і яго абмеркаванне зацягнулася на тры гады. Шмат хто

**ПРА АЎТАРА**

МЯНЬЧЭНЯ Сяргей Віктаравіч.

Нарадзіўся ў 1984 годзе ў г. Мінску. Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (2006).

У 2006–2008 гадах працававаў малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела гісторыі беларускай дзяржаўнасці Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

З 2009 года – старшы выкладчык кафедры філасофіі і гісторыі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Суіскальнік вучонай ступені кандыдата гістарычных навук.

Аўтар каля 10 навуковых прац.

Сфера навуковых інтарэсаў: узаемадзеянне дзяржавы і грамадства Беларусі ў справе барацьбы з п'янствам, гістарычная памяць і нацыянальная свядомасць беларускага народа.

лічыў гэты дакумент занадта радыкальным, таму камісія вымушана была ісці на ўступкі. Канчатковы варыянт законапраекта быў адобраны Думай толькі ў 1911 годзе і перададзены ў верхнюю палату парламента Дзяржаўны савет. Адтуль ён быў вернуты Думе ўжо чацвёртага склікання, дзе заставаўся не зацверджаным да пачатку Першай сусветнай вайны, пасля чаго яго актуальнасць у сувязі з увядзеннем «сухога закону» адпала. Сам Мітрафан лічыў, што кампрамісны варыянт законапраекта не будзе мець аніякай карысці і будзе толькі перашкаджаць справе цвярозасці *[3, с. 51]*.

Якія ж меры барацьбы з п'янствам так непакоілі дэпутатаў і былі недастатковымі з пункту гледжання самой камісіі? Звернемся непасрэдна да дакумента.

У першую чаргу законапраект даваў магчымасць мясцовым сходам прымаць «прыгаворы», згодна з якімі ў адзначанай мясцовасці зачыняліся ўсе пункты продажу моцных алкагольных напояў. Аднаўленне продажу было магчымым толькі па рашэнні новага сходу. Пры абмеркаванні гэтага пытання на сходах правам голасу надзяляліся не толькі мужчыны, якія і былі асноўнымі спажыўцамі алкаголю, але іх маці і жонкі, якія больш за ўсіх цярпелі ад сыноў ды мужоў-п'яніц. Рашэнне прымалася простай большасцю: улічваліся галасы толькі тых, хто з'явіўся на сход *[3, с. 136–137]*.

Забараняўся продаж алкаголю ў тары, меншай за $^1/_{20}$ вядра (прыкладна 0,6 літра), што дало б магчымасць ліквідаваць продаж гарэлкі папулярнымі сярод п'яніц соткамі ($^1/_{100}$ вядра) і «мярзаўчыкамі» ($^1/_{200}$ вядра) і зрабіла б гарэлку меней даступнай *[3, с. 140]*.

Забаранялася прадаваць моцныя спіртныя напоі ў час царкоўных хрысціянскіх свят, урачыстасцей, звязаных з імператарскай сям'ёй (дні нараджэння імператара, імператрыцы і спадкаемца трона, гадавіна каранацыі), а таксама ў дні кірмашоў, мясцовых сходаў, разгляду судовых спраў у валасных судах, у час прызыву навабранцаў і запасных *[4, с. 138]*. Продаж моцных напояў забараняўся таксама ва ўсіх дзяржаўных установах, у грамадскіх месцах і месцах народных гулянняў (тэатры, кінематограф, канцэрты, гарадскія сады і іншыя). У звычайныя дні продаж дазваляўся з 9 да 23 гадзін у гарадах і да 18 гадзін у сельскай мясцовасці.



◀ **Епіскап Мітрафан**

У перадсвяточныя і суботнія дні продаж спіртнога прапаноўвалася весці толькі да 2 гадзін дня. Уводзілася сістэма адказнасці за незаконны гандаль моцным алкаголем. За продаж яго за рэчы, прадукты, адпрацоўкі і ў лік доўгу і прадавец, і пакупнік падлягалі на першы раз арышту да аднаго месяца ці штрафу ад дзесяці да ста рублёў, а наступныя разы – арышту да трох месяцаў ці штрафу ад трыццаці да трохсот рублёў *[3, с. 143]*. Для арганізацыі продажу моцнага алкаголю прыватныя асобы павінны былі атрымаць патэнт ад дзяржавы: за беспатэнтны гандаль, а таксама за дастаўку і нават захоўванне моцных алкагольных напояў меркавалася ўвесці штраф *[4, с. 144]*. Відавочна, у выпадку ажыццяўлення гэтыя меры дазволілі б рэальна абмежаваць продаж і спажыванне алкаголю, але ў большасці сваёй яны так і засталіся нерэалізаванымі.

Мітрафан Гомельскі прыняў актыўны ўдзел у арганізацыі і працы першага Усерасійскага з'езда па барацьбе з п'янствам, які праходзіў у Пецярбургу 28 снежня 1909 – 6 студзеня 1910 года. Пры гэтым ён быў адзіным святаром у складзе арганізацыйнага камітэта з'езда: улады дастаткова насцярожана аднесліся да гэтай акцыі, бо яны лічылі, што з'езд стане платформай для крытыкі дзейнасці ўрада *[5,*

*с. 60]*. Выступаючы з дакладам аб задачах з'езда, епіскап адзначыў: «Наш з'езд зрабіў бы вялікую справу, калі б ён разбудзіў абыякавых, паказаўшы на грозную небяспеку ад алкагалізацыі насельніцтва. Двухгадовыя намаганні нашых заканадаўчых устаноў паказваюць, як цяжка дасягнуць якіх-небудзь станоўчых, практычных вынікаў у справе, у якой сканцэнтравана столькі і грамадскіх, і прыватных інтарэсаў. Толькі моцны супрацьалкагольны грамадскі рух можа стварыць рэальную глебу для заканадаўчых мер, а без іх ніякая сур'ёзная праца немагчыма» *[4, с. 78–79]*.

З'езд удзяліў асноўную ўвагу такім пытанням, як удзел школы ў справе барацьбы з п'янствам, дзяржаўная манаполія, спосаб збірання піцейнага падатку, яго роля і значэнне для эканамічнага жыцця краіны, недапушчальнасць сцвярджэння аб бясшкоднасці ўмеранага спажывання алкаголю, роля сацыяльна-эканамічных умоў па пытанні народнага п'янства.


ТРУДЫ
ПЕРВАГО ВСЕРОССІЙСКАГО СЪѢЗДА
ПО
БОРЬБѢ СЪ ПЬЯНСТВОМЪ.
С.-ПЕТЕРБУРГЪ
28 Декабря 1909 г. — 6 Января 1910 г.
Въ 3 томахъ.
Т. I.
С.-ПЕТЕРБУРГЪ.
Типографія П. П. Сойкина. Стремянная, № 12.
1910.

Прапановы з'езда не засталіся незаўважанымі дзяржавай і грамадствам. Актывізавалася і дзейнасць царквы ў гэтым кірунку: толькі за 1910 год было арганізавана 458 царкоўных таварыстваў цвярозасці супраць 251 у 1909-м і 140 у 1908 гадах *[5, с. 26]*. У жніўні 1912 года ў Маскве пры падтрымцы маскоўскага мітрапаліта Уладзіміра прайшоў Усерасійскі з'езд практычных дзеячаў па барацьбе з алкагалізмам. Там сабраліся ў асноўным святары праваслаўнай царквы, якія вялі актыўную антыалкагольную дзейнасць. З улікам напрацовак у дадзенай сферы і аўтарытэту епіскапа Мітрафана ён быў абраны намеснікам старшыні з'езда *[4, с. 61]*.

У тым жа 1912 годзе Мітрафана прызначылі епіскапам Мінскім і Тураўскім: гэту пасаду ён займаў аж да свайго прызначэння ў Астрахань у 1916 годзе. У Мінску яго антыалкагольная дзейнасць працягваецца. Як ганаровы старшыня мінскага Свята-Мікалаеўскага народнага брацтва ён выступаў з лекцыямі ў будынку камерцыйнага вучылішча (яно знаходзілася непадалёк ад Віленскага вакзала, цяпер гэта тэрыторыя БДУ) *[6, с. 3]*. Лекцыі карысталіся вялікай папулярнасцю сярод гараджан, а таксама сялян з навакольных вёсак, якія дзеля гэтага спецыяльна прыязджалі ў горад. Зала вучылішча нярэдка не магла прыняць усіх жадаючых. Гутаркі епіскапа Мітрафана былі заўсёды жывыя і эмацыянальныя, аднак пры гэтым ён добра арыентаваўся ў навуковым матэрыяле, лічыў, што алкагалізм можа быць пераможаны толькі сумеснымі намаганнямі царквы, навукі і закону.

Мітрафан быў прыхільнікам поўнага ўстрымання ад спіртнога і разглядаў умеранае яго спажыванне як меру малаэфектыўную і нават шкодную, бо гэта ўсё ж легалізоўвала алкаголь у вачах грамадства. Злачыннымі ён бачыў заявы аб карысці алкаголю: «Усе, хто лічыць, што гарэлка гэта карысны, гігіенічны і нават пажыўны прадукт, павінны найперш заахвоціць да яе спажывання сваіх блізкіх» *[3, с. 49]*.

Епіскап Мітрафан рэзка крытыкаваў дзяржаўную палітыку «п'янага бюджэту», якая склалася ў выніку ўвядзення дзяр-

жаўнай манаполіі на продаж моцных алкагольных напояў. Даход ад продажу гарэлкі ён называў шкодным і для самой дзяржавы, бо насельніцтва паступова рабілася неплацежаздольным. «Цвярозасць народа – ёсць выдатны ўклад капіталу ў будучыню, яна стварае багацце для будучых падаткаў. Алкагалізацыя ж – шлях да банкруцтва», – прыводзіў ён словы швейцарскага прафесара Фарэля *[3, с. 20]*.

Сапраўды, да 1907–1908 гадоў даходы ад дзяржаўнай манаполіі на продаж моцных алкагольных напояў увесь час раслі і дасягнулі 700 млн рублёў, аднак у наступныя гады адзначыўся паступовы спад *[4, с. 11]*. Алкагольны даход дасягнуў свайго максімуму і склаў значную долю затрат насельніцтва. Так, сярэдні гадавы даход рабочага ў Расіі быў каля 100 рублёў, з якіх амаль 20 прапіваліся, у той час як на Захадзе рабочы атрымліваў каля 600–700 рублёў, але пры фактычна тых жа затратах на алкаголь *[3, с. 12]*. Праблемы алкагалізацыі і беднасці насельніцтва былі цесна звязаны паміж сабой і неслі пагрозу ўладзе. Павышэнне цэн на гарэлку, якое нібыта рабілася для абмежавання спажывання алкаголю, на самай справе толькі давала дадатковы даход у бюджэт. Каб гэтая мера стала дзейснай, Мітрафан лічыў мэтазгодным павышэнне цаны мінімум у два разы *[3, с. 20]*. На яго думку, урад і імператар павінны былі прыняць меры па адмове ад «п'яных» грошай, накіроўваўшы іх на патрэбы мясцовых бальніц і школ, якія павінны былі стаць галоўнай зброяй у барацьбе з п'янствам. Дзяржаўная палітыка па ўмацаванні народнай цвярозасці магла б даць той жа эфект і народную падтрымку, як і адмена прыгоннага права, лічыў Мітрафан: «Цвярозасць народа стане новай свабодай…» *[3, с. 15–16]*.

Афіцыйныя лічбы статыстыкі ставілі Расійскую імперыю ў шэраг краін, дзе ўжыванне алкаголю было дастаткова нізкім. Так, згодна з данымі за 1906–1910 гады, у Расіі спажыванне алкаголю на душу насельніцтва (у літрах абсалютнага алкаголю) складала 3,41 літра. Для параўнання: у Францыі – 22,93, Вялікабрытаніі – 9,67, Германіі – 8,52 літра. З еўрапейскіх краін афіцыйна толькі Нарвегія спажывала алкаголю менш, чым Расія *[7, с. 116–117]*. Аднак епіскап Мітрафан лічыў, што гэтыя лічбы не аб'ектыўныя: «Мы жывём у краіне




▲ **Этыкетка для алкагольных напояў, зацверджаная Камісіяй аб мерах барацьбы з п'янствам**

алкагалізму, бо ўвогуле наша статыстыка кульгае, а ў адносінах да п'янства не можа пахваліцца сваёй аб'ектыўнасцю і дакладнасцю… На Захадзе лічбы прыводзяцца, каб даць рэальную карціну і звярнуць увагу на праблему, а ў Расіі – каб знайсці суцяшэнне» *[3, с. 54]*.

Афіцыйная статыстыка не ўлічвала і не магла ўлічыць алкаголь, які выраблялся ў хатніх умовах і прадаваўся ў таемных прытонах. Дарэчы, колькасць іх за гады існавання дзяржаўнай манаполіі вырасла з 2415 у 1897 годзе да 32 675 у 1904-м *[3, с. 53]*. Да таго ж, Мітрафан прапаноўваў скарэкціраваць лічбы ў сувязі з нераўнамерным распаўсюджваннем п'янства сярод насельніцтва. Пры падліках спажывання алкаголю на душу насельніцтва трэба было ўлічыць, што асобныя катэгорыі насельніцтва імперыі (яўрэі, мусульмане, стараверы) спіртнога амаль не спажывалі, нізкі ўзровень спажывання алкаголю назіраўся і сярод жанчын

*[3, с. 55]*. Такім чынам, пры больш дакладных падліках карціна не выглядала ўжо такой пазітыўнай.

Мітрафан адмоўна ставіўся да ідэі барацьбы з п'янствам шляхам скарачэння спажывання гарэлкі за кошт іншых спіртных напояў. У красавіку 1906 года быў прыняты закон аб свабодным адкрыцці піўных крам. З мэтай папулярызацыі пеннага напою піўныя ствараліся па спрошчаных схемах, а іх уладальнікі плацілі значна менш падаткаў, чым гаспадары шынкоў. Гэтыя меры прывялі да рэзкага павелічэння спажывання піва. Калі ў 1902 годзе насельніцтва Расійскай імперыі выпіла 46 мільёнаў вёдзер піва (вядро = 12,3 літра), то ў 1906-м гэтая лічба дасягнула 71 мільёна, а да 1912 набліжалася да 100 мільёнаў *[6, с. 24]*. Аднак пры гэтым і спажыванне гарэлкі не скарацілася, што прывяло да павелічэння спажывання алкаголю ўвогуле.


Аще ѡбѣщаеши ѡбѣтъ Бг҃ꙋ, не оумедли ѡдати его (Еккл. 5,3)
Молись! Трезвись!
ОБЕТНАЯ ГРАМОТА
Во имя Отца и Сына и Святаго Духа
Дана сия возлюбленному(ой) брату (сестре) нашему(ей) ______________________ в том, что он(а), пришед в себя, в церкви (название) ______________________ пред пречистым образом (название) ______________________ изъявил(а) твердое намерение и дал(а) крепкое обещание не пить спиртного и не употреблять ничего наркотического, а также не склонять к тому и других, равно не принимать никакого участия в различного рода предосудительных играх и не произносить скверных, гнилых слов, сроком на ______________________
В чем да поможет ему(ей) Господь Бог силою Честнаго Животворящаго Креста, заступлением Всепречистыя Владычицы нашея Богородицы и молитвами всех святых. Аминь.
Название храма: ______________________
Настоятель: ______________________
Подпись дающего Обет трезвости: ______________________
Свидетели: ______________________
«____» ______________ 20____ г.
Учись! Трудись!
Никто впредь да не предается предосудительной игре (VI Вс. собор. пр. 51)
Всяко слово гнило да не исходитъ изъ оустъ вашихъ (Ефес. 4,29)
Не оупивайтеся виномъ... но паче исполняйтеся Духомъ (Ефес. 5,18)
Издано Школой трезвения Санкт-Петербургского православного клуба «Бодрствование» во имя св. муч. Вонифатия

Мітрафан выказваўся па гэтай праблеме наступным чынам: «Прывучаючы рускага чалавека да піва, вы яго немцам не зробіце і метадычнай стрыманасці не атрымаеце» *[3, с. 102]*. Акрамя адмоўнага ўплыву на здароўе насельніцтва, павелічэнне спажывання піва мела ў тым ліку і адмоўныя эканамічныя наступствы. У адной са сваіх прамоў Мітрафан адзначаў: «Калі чалавек купіў бутэльку гарэлкі за 50 капеек і напіўся, то піва яму давядзецца выпіць два тузіны бутэлек» *[6, с. 24]*. Такім чынам, затраты п'яніц на алкаголь значна павялічваліся, што вяло да далейшага збяднення насельніцтва.

Вызначаючы алкагалізм як агульную праблему грамадства, Мітрафан абвяргаў тэзіс аб тым, што п'янства – вынік неадукаванасці. Ён прыводзіць наступныя даныя: згодна з ананімнымі апытаннямі, алкаголь спажывалі 60 % навучэнцаў пачатковых навучальных устаноў і 75 % студэнтаў універсітэтаў, у жаночых навучальных установах – 40 % *[6, с. 36]*. У якасці меры па барацьбе з п'янствам Мітрафан прапанаваў ідэю антыалкагольнай адукацыі. У школах прапаноўвалася вывешваць табліцы з лічбамі спажытага алкаголю ў краіне і называннем той шкоды, што ён наносіць здароўю. На ўроках Закона Божага трэба было прыводзіць з Бібліі прыклады негатыўных наступстваў ад спажывання алкаголю, такія, напрыклад, як адсячэнне галавы Іаана Прадцечы і гісторыя Самсона, якому адрэзалі валасы і адабралі сілу ў той час, калі ён быў п'яны. У вышэйшых навучальных установах епіскап прапаноўваў адкрыць асобныя кафедры, дзе б вывучалася праблема п'янства і чыталіся лекцыі па барацьбе з ім *[6, с. 37–38]*.

Тэма барацьбы з алкаголем як адным з галоўных ворагаў чалавецтва знаходзіла адлюстраванне і ў размовах епіскапа з прыхаджанамі ў час богаслужэнняў: «Віно губіць і цела наша і душу, скарачае жыццё зямное і пазбаўляе царства нябеснага. Цела п'яніцы плача, бо яно пазбаўлена прыроднай моцы. І як не тужыць яго душы, якая ўсведамляе высакароднасць свайго паходжання, ведае аб сваёй нябеснай Айчыне,




◀ **Антыалкагольны плакат**

але як яна прыніжана і зняслаўлена» *[3, с. 182]*.

Галоўнай праблемай алкагалізму Мітрафан называў абыякавасць і паблажлівасць у адносінах да п'яніц. Ён лічыў, што толькі тады, калі спажыванне алкаголю будзе разглядацца як недапушчальны для культурнага грамадства ўчынак, стане магчымай паспяховая барацьба з алкагалізмам, і яе павінен весці кожны: «Як ворага на вайне агульнымі сіламі адціскаюць, ахопліваюць і знішчаюць, так трэба рабіць і ў дачыненні да алкаголю» *[6, с. 29]*.

Епіскап Мітрафан верыў у перспектывы пашырэння цвярозасці, у выніку чаго «з маленькіх таварыстваў узнікне і вырасце магутны рух, які прывядзе нас і ўсю святую Русь да таго шчасця, якое мы самі губім і топім у віне» *[3, с. 185]*. На жаль, надзеям яго не было суджана спраўдзіцца.

Праблема алкагалізацыі грамадства, з якой у свой час змагаўся епіскап Мітрафан, актуальная і сёння. Шмат што змянілася з таго часу, шмат якія яго думкі могуць падацца занадта ідэалістычнымі і недасягальнымі, аднак безумоўным з'яўляецца яго тэзіс аб неабходнасці аб'яднання ўсіх сіл дзяржавы, царквы і грамадства для паспяховага вырашэння гэтай праблемы.

## ЛІТАРАТУРА

1. Бондаренко, К.М. Епископ Гомельский Митрофан и его монархические нравоучения / К.М. Бондаренко // Религия и общество – 5: актуальные проблемы свободы совести: сб. науч. статей Междунар. науч.-практ. конф., г. Могилев, 6 мая 2010 г. / под общ. ред. В.В. Старостенко, О.В. Дьяченко. – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2010. – С.12–14.
2. Священномученик Митрофан (Краснопольский), архиепископ Астраханский и Енотаевский // Гомельская епархия русской православной церкви [Электронный ресурс].– 2013. – Режим доступа: http://www.eparhiya.by/23-eparxiya-katagoria/publikacii/187-svyashchennomuchenik-mitrofan-krasnopolskij-arkhiepiskop-astrakhanskij-i-enotaevskij. – Дата доступа: 15.12.2014.
3. Митрофан. В борьбе за трезвость / Епископ Митрофан. – Минск: Мин. православ. Свято-Николаев. нар. братство, 1913. – 190 с.
4. Труды первого Всероссийского съезда по борьбе с пьянством: С.-Петербург, 28 декабря 1909 г. – 6 января 1910 г.: в 3 т. – Т. 1. – СПб., 1910.
5. Афанасьев, И.Н. Борьба государства и общества за народную трезвость в России: 1861–1914 гг. / И.Н. Афанасьев. – СПб., 2011. – 128 с.
6. Митрофан. Беседа о вреде алкоголя и средствах борьбы с ним / Епископ Митрофан. – Минск: Электротипография С.А. Некрасова, 1912. – 48 с.
7. Зайцева, Л.И. С.Ю. Витте и Россия. Ч. 1: Казенная винная монополия, (1894–1914): По науч. публ. и арх. материалам конца XIX – нач. XX в. / Л.И. Зайцева; под ред. Л А. Зубченко. – М.: Ин-т экономики РАН, 2000. – 299 с.